Сямейная газета
Выпуск № 11 (34)



## НЕ СТАМЛЯЙЦЕСЯ ЗДЗІЎЛЯЦЬ

Не так даўно са знаёмай абменьваліся думкамі наконт выхавання дзяцей. Сышліся на тым, што гарантый шчасця няма: ніколі не ўгадаеш, кім вырасце твая крывіначка. Але гэта і добра. Пагадзіцеся, не цікава было б жыць, калі б шчасце было гарантавана. Ніякай прасторы для эксперыментаў. У мяне пакуль, у адрозненне ад Рымачкі, няма Сціпана, але разумею, што выхаванне дзіцяці — гэта надзвычай творчы працэс.

З захапленнем назіраю, як выхоўвае сваіх дзяўчынак яшчэ адна знаёмая маладая мама. Наташа (гэта так краналька!) завяла «каробкі дзяцінства» для кожнай з дачок. Не ведаю дакладна, што яна там захоўвае, але, мяркую, што бірачкі з раддома, першы выпаўшы зуб, сукеначку, у якой хрысцілі, першы малюнак... Усё, што лічыць важным і памятным. А на днях у сацыяльных сетках з'явіўся яе новы пост: «Зрабілі з дзеткамі партрэты членаў нашай сям'і. Партрэты па рэчах. Спачатку выклалі на падлозе рамку з алоўкаў. А потым шукалі ў доме ўсё, што нас характарызуе. Цікава было назіраць, як дочкі стваралі мамін і татаў партрэты... «Тата любіць чытаць, жонку і гуляць з намі... Яшчэ любіць варыць кашу і пыласосіць... Так «любіць жонку» паклалі, што яшчэ?» — чулася з пакоя...»

Тое ж і з узаемаадносінамі мужа і жонкі. Яны, пераканана, патрабуюць не менш творчага падыходу. Можна, вядома, скласці рукі, маўляў, няхай цячэ, як цячэцца. Але тады не трэба здзіўляцца, чаму спяшацца з працы дадому (у аднатыпнасць і будзённасць) нікому не хочацца.

У маёй былой аднакурсніцы і яе мужа ёсць цудоўная сямейная традыцыя, якую раю пераняць усім, незалежна ад колькасці сумесна пражытага і перажытага «Спатканне ўслепую». Яе сутнасць у тым, што адзін з пары ведае пра гэтае спатканне ўсё, другі — нічога, акрамя даты і часу. Пры гэтым месца і ідэя сустрэчы павінны быць нечаканымі. Можна, напрыклад, звадзіць мужа ў цырк (калі ён не быў там з дзяцінства), як зрабіла Насця, ці адкрыць для жонкі-мінчанкі, як зрабіў Жэня, невядомы дагэтуль Мінск. «Ператварыць свой дзень у нешта яркае, неардынарнае, запамінальнае вельмі проста. І як рэдка, пры ўсёй даступнасці, гэта робяць людзі вакол, — піша Насця ў сямейным блогу. — Зараз, калі нас двое, мы радуем адно аднаго. Пазней такімі ж рэчамі абавязкова будзем радаваць сваіх дзяцей. Бо нішто ў дзяцінстве не запамінаецца лепш, чым мілыя бацькоўскія традыцыі накшталт «кожнае 1 верасня тата купляў мне кавун» або «ў чэрвені у нашай сям'і спаборніцтва па зборы чырвонагаловікаў...»

У сямейным жыцці, як і ва ўсім, ніколі нельга спыняцца. І ленавацца. Памятайце пра гэта. І не стамляйцеся здзіўляцца і здзіўляць адно аднаго. Гэта не толькі надасць вастрыні і цікавасці сямейнаму баўленню часу, але і дапаможа захаваць свежасць пачуццяў. Каб нават праз мноства гадоў адчуваць тое ж хваляванне, што ў самым пачатку.

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

# «МОЙ ТАТА ПАЎ-КОЎ-НІК!»

**Залацістыя наплечныя знакі з трыма вялікімі зоркамі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны атрымалі праваахоўнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Цяпер ужо палкоўніка Аляксандра ПРАХАРЭНКУ, намесніка начальніка Цэнтральнага РУУС сталіцы (на фота), прыйшлі падтрымаць жонка Алеся і маленькая дачка Елізавета.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Мы вельмі спадзяваліся, што Саша стане палкоўнікам, — прызнаецца жанчына. — Разам з тым, пэўная доля адказнасці ўскладаецца і на сям'ю. Акрамя гонару, мы адчуваем, што ў нашага таты цяпер будуць новыя турботы. Будзем падзяляць усё разам з ім.

***— А дачка ўжо ведае, што яе тата міліцыянер?***

— Безумоўна, і яна ўсім расказвае пра гэта. А цяпер яшчэ кажа, што яе бацька палкоўнік. Ліза, хто твой тата? — нахіляецца да дачкі маці.

— Мой тата Паў-коў-нік! — з усмешкай кажа дзяўчынка і праз некалькі секунд адбягае фатаграфавацца разам з бацькам.

А вось Сяргей Волкаў прыехаў на ўрачыстасць з Магілёва.

— Пагоны, якія прысвоены паводле ўказа Прэзідэнта, уручаў міністр, а таму яшчэ да пачатку мерапрыемства было хвалююча, — кажа **намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі УУС Магілёўскага аблвыканкама Сяргей ВОЛКАЎ**. — Аднак, калі трапіў у гэты музей, адчуў яго гістарычнасць, пачуцці нахлынулі яшчэ больш...

***— Падобнае званне атрымлівае далёка не кожны міліцыянер. Гонар за сябе адчуваеце?***

— Для таго, каб навучыцца абараняць і паважаць іншых, трэба найперш навучыцца паважаць сябе. Безумоўна, гонар, самапавага прысутнічае, але падобнае пачуццё мяжуе з яшчэ большай адказнасцю за свой калектыў, за сябе, за сям'ю, за сваю краіну.

— Для большасці нашых супрацоўнікаў званне палкоўніка міліцыі — фінішнае, — кажа **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ**. — Яно гістарычна самае важнае. І кожны, хто атрымлівае яго, адчувае большую адказнасць, на маю думку, становіцца нават больш зграбным. Пры гэтым само яно мудрасці і розуму не дабаўляе, аднак да многага абавязвае. І ў тым ліку да таго, каб навука кіравання стала асновай будучай службы, каб чалавек і яго акружэнне разумелі, што ён палкоўнік міліцыі.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Фестывалім!

# УРОКІ Ў «МЯККАЙ ШКОЛЕ»

**100 чалавек, у тым ліку 48 дзяцей, узялі ўдзел у першым у Беларусі фестывалі сем'яў усынавіцеляў, які прайшоў у Валожынскім раёне.**

У сем'ях усынавіцеляў умовы пражывання і выхавання дзяцей кантралююцца на працягу трох гадоў. А далей бацькі могуць звяртацца па дапамогу, калі неабходна. З прычыны таго, што часам у такіх сем'ях узнікаюць пэўныя цяжкасці з выхаваннем дзяцей, Нацыянальны цэнтр усынаўлення сумесна з упраўленнем адукацыі Мінаблвыканкама і вырашылі правесці фестываль, дзе ўсе праблемныя пытанні можна разгледзець у нефармальных умовах. У праведзенні ўрокаў у «Сямейнай мяккай школе», семінараў і практыкумаў, арт-тэрапеўтычных заняткаў, майстар-класаў удзельнічалі вопытныя псіхолагі.





28 сем'яў, якія ўжо ўсынавілі дзяцей, і 2 сям'і — кандыдаты ва ўсынавіцелі пражывалі ў палатках альбо ў нумарах на базе аздараўленчага цэнтра «Галактыка». Фестываль, на думку ўдзельнікаў, дапамог ім развітацца з міфамі, якія існуюць на гэтую тэму, упэўніў у меркаванні, што можна і трэба казаць пра ўсынаўленне адкрыта.

— Гэтае мерапрыемства яшчэ раз паказала, што ўсе цяжкасці, якія могуць узнікаць у сем'ях усынавіцеляў, пераадольныя, — падкрэсліла **начальнік аддзела сацыяльнай і выхаваўчай работы ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Вольга ГЛІНСКАЯ**. — Весела праведзены час на прыродзе дазволіў бацькам і іх дзецям яшчэ больш згуртавацца, знайсці шляхі вырашэння праблем, пазнаёміцца з аднадумцамі. Сем'і ўсынавіцеляў маюць патрэбу ў такіх зносінах. Таму я думаю, што падобныя фестывалі будуць праводзіцца штогод.

**Надзея ПАЎЛАВА** ■